Давайце імкнуцца да лагоднасці і пакоры

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
10.12.2017 00:00



Напярадзе чарговыя дні радаснага чакання прыходу Пана. Гэта асаблівы час падрыхтоўкі да такой вялікай падзеі, як Божае Нараджэнне. Няхай Адвэнт кожнаму нагадае пра тое, што ў наша зямное вымярэнне ўваходзіць надзвычайная рэчаіснасць.

Чаканне свят можа выглядаць па-рознаму. Рыхтуючыся да іх, людзі не заўсёды канцэнтруюцца на самым важным. Засяроджваюць сваю ўвагу на выбары падарункаў, гатаванні страў і арганізацыі стала, высыланні віншавальных паштовак. На жаль, знешняе часта прыцягвае больш, чым справы душы і збаўлення.

Кожны падобны перыяд павінен, у першую чаргу, заахвоціць чалавека прыглядзецца да самога сябе, да сваіх слабасцей. Аднак заўсёды – у прысутнасці Бога. У Адвэнце нам неабходна клапаціцца аб далейшай перспектыве для ўсяго, што робім і плануем. Часта, каб гэта зразумець, трэба запаволіцца, а няраз нават і спыніцца. † Затрымацца і запрасіць Пана ў сваю душу, каб Ён пачаў дзейнічаць у нашым жыцці. Галоўнае – клапаціцца пра сэрца, каб яно было адкрытым на любячага Збаўцу.

На пачатку Адвэнта 1936 года св. Фаустына пісала: “Маці Божая навучыла мяне, як падрыхтавацца да свята Божага Нараджэння. Сказала: «Дачка мая, імкніся да лагоднасці і пакоры, каб Езус, які заўсёды жыве ў тваім сэрцы, мог адпачыць. Адаруй Яго ў сваім сэрцы, не выходзь з сябе... Пастаянна будзь з Ім – і Ён будзе тваёй моцай»” (Дз. 785). У гэты час ласкі павінна абвастрацца адчувальнасць на Езуса, які прыходзіць да нас у кожную хвіліну жыцця: у Эўхарыстыі, Божым слове, малітве, падзеях і – што самае важнае, але часцей за ўсё найбольш утоенае – у прысутнасці іншага чалавека.

Часта гаворым, што “час ляціць хутка”, “дні здаюцца карацейшымі”. Таму варта пастарацца, нягледзячы на велізарную колькасць абавязкаў і святочную “ліхаманку”, выкарыстаць астатнія дні Адвэнту для таго, каб у пэўнай меры суцішыцца і запаволіць пульсуючы спешкай рытм жыцця.

Дарагія Чытачы!

Давайце ў правільным духу падрыхтуемся да надыходзячых свят. Памятайма, што адпаведная падрыхтоўка адбываецца ў звышнатуральным вымярэнні. Толькі

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
10.12.2017 00:00

глыбока ў душы можам перажыць вялікую таямніцу Божага Уцелаўлення і толькі сэрцам можам спяваць разам з Анёламі “Хвала Богу на вышынях...”.